• *Твае героі, Шуміліншчына* •

МУЖНАЕ СЭРЦА ПАТРЫЁТА

МНОГІМ воінам, многім нашым людзям давялося зведаць усю горыч цяжкага шляху ўлетку 1941 года, калі пад напорам вераломных фашысцкіх полчышчаў вымушаны былі адступаць углыб сваёй краіны, пакідаючы гарады, вёскі, пасёлкі.

Але савецкі народ быў упэўнены, што гэта не канец, Радзіма будзе вызвалена, а гітлераўскі фашызм будзе сцёрты з твару зямлі. Менавіта аб гэтым сведчылі мужнасць і гераізм абаронцаў Брэсцкай крэпасці. Многія сотні гітлераўцаў паляглі на подступах да яе ў першыя дні вайны. А 29 чэрвеня 1941 года, калі асноўныя сілы фашыстаў былі ўжо за сотні кіламетраў ад Брэста, у крэпасці адбыўся партыйны сход. Камуністы акружанага з усіх бакоў воінскага гарнізона прынялі пастанову: Брэсцкую крэпасць ворагу не здаваць!

І гэта далёка не адзіны прыклад. З першага дня, у першыя мінуты вайны ўступіў у ярасны бой з фашысцкімі сцярвятнікамі і наш зямляк, ваенны лётчык-афіцэр Мікалай Кузьміч Спірыдзенка. 49-ы авіяцыйны полк, дзе ён служыў, размяшчаўся тады недалёка ад латвійскага горада Даўгаўпілс. Пілоты ўдасканальвалі сваё лётнае майстэрства, займаліся баявой і палітычнай падрыхтоўкай, многа ўвагі ўдзялялі фізкультуры і спорту. А на досвітку 22 чэрвеня разам з іншымі баявымі сябрамі ўзняў сваю чырвоназорную баявую машыну ў паветра і Мікалай Спірыдзенка, каб не пусціць углыб Радзімы нямецкіх сцярвятнікаў. Адважна ўступілі ў схватку з фашыстамі нашы сокалы. Гітлераўцы страцілі тры бамбардзіроўшчыкі і, нягледзячы на значную колькасную перавагу, у паніцы адступілі. У той незабыўны дзень М. К. Спірыдзенку і яго таварышам давялося зрабіць яшчэ па некалькі баявых вылетаў.

Складанае і адказнае заданне было даручана Мікалаю Спірыдзенку ў ноч з 23 на 24 чэрвеня. Яму неабходна было прыкрываць з паветра адпраўку ў тыл з мясцовай чыгуначнай станцыі трох эшалонаў, у адным з якіх эвакуіраваліся сем'і ваеннаслужачых.

Набраўшы адпаведную вышыню, знішчальнік Спірыдзенкі імкліва пайшоў кругам над ахоўваемым аб'ектам. Лётчык пільна ўглядаўся ў начное неба. Нейкі час нічога падазронага не было. Але раптам з-за воблакаў вынырнуў самалёт з чорнымі крыжамі. Не раздумваючы ні секунды, Спірыдзенка кінуў сваю машыну на збліжэнне з ворагам. Фашысцкі лётчык не паспеў і апамятацца, як яго самалёт прашыла вогненная кулямётная чарга. Варожы сцярвятнік, нервова здрыгануўшыся, пайшоў уніз, цягнучы за сабой густы хвост дыму. Неўзабаве з зямлі данёсся моцны выбух. Нямецкі самалёт узарваўся на ўласных бомбах. А на баявым рахунку савецкага лётчыка Мікалая Спірыдзенкі з'явіўся першы збіты ім фашысцкі самалёт.

Яшчэ да пачатку Вялікай Айчыннай вайны Мікалай Кузьміч Спірыдзенка валодаў немалым баявым, практычным вопытам. У снежні 1939 года ён у саставе свайго авіяцыйнага палка ўдзельнічаў у баях з белафінамі. У складаных умовах надвор'я той лютай зімы М. К. Спірыдзенка зрабіў 96 баявых вылетаў, паказаў сябе смелым і ініцыятыўным, знаходлівым ваенным лётчыкам. Радзіма, камандаванне Ленінградскага фронту высока ацанілі воінскую доблесць, баявыя здольнасці лётчыка. 21 мая 1940 года Мікалай Кузьміч Спірыдзенка атрымаў з рук Міхаіла Іванавіча Калініна сваю першую баявую ўзнагароду — ордэн Чырвонай Зоркі.

З ранніх юнацкіх гадоў марыў камсамолец, сялянскі хлопец з вёскі Беразуха, што на Шуміліншчыне, аб подзвігах у імя шчасця Радзімы, хацеў стаць ваенным лётчыкам. Таму і сёння Мікалай Кузьміч Спірыдзенка лічыць важнейшым у сваім жыцці дзень, калі летам 1936 года яго выклікалі ў Сіроцінскі райком камсамола і прапанавалі паступіць вучыцца ў Віцебскі аэраклуб. Праз год з выдатнай характарыстыкай начальніка аэраклуба Мікалай паехаў у Барысаглебск, дзе стаў курсантам ваеннай авіяцыйнай школы імя Чкалава, якую паспяхова закончыў у студзені 1939 года.

Як мы ўжо ведаем, Мікалай Кузьміч з першых дзён вайны з гітлераўскай Германіяй паказаў сябе вопытным і ўмелым, грозным для ворага лётчыкам. Крыху пазней у званні маёра М. К. Спірыдзенка камандаваў авіяэскадрылляй, а затым знішчальным авіяпалком на розных франтах. У 1942 годзе баявыя сябрыкамуністы прынялі яго ў рады партыі Леніна.

Са шматлікіх паветраных баёў Мікалай Кузьміч Спірыдзенка часцей за ўсё ўспамінае паветраныя схваткі на Курскай дузе. 14 ліпеня 1943 года ён атрымаў загад камандавання ўзначаліць васьмёрку знішчальнікаў для суправаджэння групы штурмавікоў у варожы тыл, дзе яны павінны былі нанесці ўдар па скапленню фашысцкай жывой сілы і тэхнікі. Пакуль даляцелі да вызначанай цэлі, нашым лётчыкам давялося двойчы ўступаць у жорсткі бой з нямецкімі знішчальнікамі. На зваротным шляху становішча яшчэ больш ускладнілася. Мікалай Кузьміч аб гэтым у сваіх успамінах піша, што калі штурмавікі закончылі «работу» і лягі на зваротны курс, ён заўважыў на вялікай вышыні строй бамбардзіроўшчыкаў праціўніка, якія ляцелі пад прыкрыццём групы знішчальнікаў. Самалёты трымалі курс на нашу тэрыторыю.

У такім становішчы часу на роздум не заставалася. Мікалай Кузьміч імгненна прыняў рашэнне. Для суправаджэння сваіх штурмавікоў ён пакінуў адно звяно з трох знішчальнікаў. Астатнім загадаў неадкладна атакаваць групу фашысцкіх самалётаў. Бой быў няроўным. Пяць нашых знішчальнікаў рынуліся ў схватку з 22 варожымі бамбардзіроўшчыкамі і 12 знішчальнікамі «Фокке-Вульф-190». Але М. К. Спірыдзенка ўмела выкарыстаў такі важны ў любым баі фактар, як раптоўны напад, вёў свае машыны на збліжэнне з ворагам з сонечнага боку і сам першым кідаўся на вядучы самалёт гітлераўцаў. Фашысцкія пілоты заўважылі небяспеку, але ў гэты момант М. К. Спірыдзенка, злавіўшы ў прыцэл вядучую машыну праціўніка, націснуў на гашэтку. Нямецкі самалёт штопарам паляцеў уніз. Амаль адначасова пайшоў да зямлі і другі фашысцкі самалёт, збіты нашым лётчыкам Аляксеем Разінавым.

Бой узмацняўся з кожным імгненнем. Мікалай Кузьміч нечакана заўважыў, што адзін з нямецкіх самалётаў пагражае вядомаму Смольнікаву. Ён кінуў свой знішчальнік на выручку таварышу і збіў у гэтым баі яшчэ адзін самалёт праціўніка.

Калі гаручае і боепрыпасы былі на зыходзе, М. К. Спірыдзенка загадаў лётчыкам сваёй групы выходзіць з бою.

У лістападзе 1944 года маёра М. К. Спірыдзенку, як выдатнага лётчыка, таленавітага камандзіра авіяпалка камандаванне накіравала на вучобу ў Ваенна-Паветраную акадэмію. У той час ён меў ужо на сваім баявым рахунку 337 баявых вылетаў, удзельнічаў у 85 паветраных баях, асабіста збіў 15 самалётаў праціўніка і 6 самалётаў — у групавых баях. Улічваючы гэтыя заслугі праслаўленага лётчыка і камандзіра, 23 лютага 1945 года Мікалаю Кузьмічу Спірыдзенку было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Ваенна-Паветраную акадэмію М. К. Спірыдзенка закончыў у 1950 годзе. А ў 1957 годзе ён паспяхова закончыў і Ваенную Акадэмію Генштаба. У 1961 годзе М. К. Спірыдзенку было прысвоена званне генерал-маёра.

Каля дваццаці пасляваенных гадоў Мікалай Кузьміч аддаў службе ў Савецкай Арміі. Ён быў камандзірам авіяцыйнага палка, начальнікам баявой падрыхтоўкі Ваенна-Паветраных Сіл Сібірскай ваеннай акругі, камандзірам авіяцыйнага злучэння, а з 1962 года — выкладчыкам Ваенна-інжынернай акадэміі імя Ф. Э. Дзяржынскага.

З 1970 года Герой Савецкага Саюза генерал-маёр Мікалай Кузьміч Спірыдзенка ў запасе. Жыве ў Маскве, вядзе вялікую грамадскую, выхаваўчую работу, з'яўляецца лектарам таварыства «Веды», старшынёй савета ветэранаў 309-й знішчальнай авіяцыйнай дывізіі. Часам прыязджае Мікалай Кузьміч у родныя мясціны, на Шуміліншчыну. Тут ён заўсёды бывае дарагім, жаданым госцем у сваіх землякоў, моладзі, школьнікаў. Ёсць аб чым расказаць ім праслаўленаму ветэрану, камуністу, удзельніку дзвюх войнаў, аддаўшаму службе Радзіме каля трыццаці пяці гадоў жыцця, чалавеку мужнага сэрца, беззапаветна адданаму вялікай справе партыі Леніна.

В. УЛАДЗІМІРАЎ.